*Музейны квартал*

# АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНАГА МУЗЕЯ ЯКУБА КОЛАСА ДА ЮБІЛЕЮ ПЕСНЯРА

Юбілейны 2012 год стаў адным з самых цікавых і напружаных у навукова-асветніцкай дзейнасці Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Падрыхтоўка да ўрачыстай даты пачалася яшчэ летась. Развіваючы міжнародныя адносіны, музей заключыў чатыры дамовы аб творчым супрацоўніцтве з партнёрамі з блізкага і далёкага замежжа. На працягу 2011 г. заключаны пагадненні аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве і абмене выстаўкамі з наступнымі ўстановамі:

• Музеем зямлі Хэлмінскай (Хэлмна, Рэспубліка Польшча); тут праведзена выстаўка "Зямля – аснова ўсёй Айчыне";

• Літаратурным музеем Уладзіслава Бранеўскага (Варшава, Рэспубліка Польшча); дасягнута дамоўленасць аб абмене выстаўкамі на працягу 2012 г.;

• Дзяржаўным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам А. С. Пушкіна "Міхайлаўскае" (Расійская Федэрацыя); намі арганізавана выстаўка з фондаў гэтага музея "Дарога да Пушкіна", якая праходзіла з 30 лістапада 2011 г. да 10 студзеня 2012 г.;

• Літаратурным музеем Аляксандра Пушкіна (Вільнюс, Літва); дасягнута дамоўленасць аб абмене выстаўкамі на 2012 і наступныя гады.

На працягу бягучага года адбыўся шэраг цікавых і значных мерапрыемстваў для розных катэгорый наведвальнікаў, а гэта найперш школьнікі і студэнцкая моладзь, таму асноўная ўвага была скіравана на іх эстэтычныя і інтэлектуальныя патрэбы.

У студзені музей стаў пляцоўкай для змястоўных і цікавых імпрэз. Сярод іх:

• літаратурная сустрэча з нагоды прыняцця ў члены грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі" паэтаў і празаікаў Ірыны Тулупавай, Вольгі Паўлючэнкі, Іны Фраловай, Адама Шостака;

• дзіцячы ранішнік "Калядныя сустрэчы ў дзядзькі Якуба" з удзелам фальклорнага гурта д/с № 266 г. Мінска, які стала супрацоўнічае з музеем і штогод стараецца паказаць новую, арыгінальную праграму;

• сустрэча з рэдакцыяй часопіса "ЖЖ. Женский журнал", што мела назву "Беларуская літаратура ў глянцавым часопісе, глянцавы часопіс у беларускай літаратуры, альбо Вечар дзіўных супадзенняў" (у межах традыцыйнага праекта "Творчыя сустрэчы з рэдакцыямі перыядычных выданняў творчай і навуковай інтэлігенцыі рэспублікі");

• святочны канцэрт "Фартэпіянныя мініяцюры беларускіх кампазітараў" у выкананні выхаванцаў ДМШ № 19 г. Мінска;

• літаратурны вечар "Вячэра Бёрнса", прымеркаваны да 253-й гадавіны з дня нараджэння



**Фрагмент экспазіцыі ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.**

шатландскага паэта, з удзелам прадстаўнікоў пасольства Вялікабрытаніі.

Асобна хочацца адзначыць літаратурны вечар у межах праекта "Пад нёманаўскім сонцам", прымеркаваны да 70-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта Міколы Маляўкі. Гэтая сустрэча была пілотнай у праекце, які на працягу года аб'яднаў многіх славутых людзей Стаўбцоўскай зямлі: параалімпійскую чэмпіёнку па лёгкай атлетыцы Вольгу Зінкевіч, краязнаўцу і старшыню дабрачыннага савета музея Якуба Коласа Анатоля Грэкава, малодшага сына паэта Міхася Міцкевіча, лаўрэата Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі "Музейная справа" Зінаіду Камароўскую.

Люты запомніўся гасцям дома Коласа не менш значнымі падзеямі: гэта і творчая сустрэча са здымачнай групай тэлефільма "Талаш" па аповесці "Дрыгва" Якуба Коласа, які быў зняты ў мінулым годзе на кінастудыі "Беларусьфільм", і літаратурна-музычная імпрэза да Дня ўсіх закаханых "Шчаслівы мамэнт". У лютым адбыўся адзін з канцэртаў класічнай музыкі з музейнага цыкла "Поры года ў доме Якуба Коласа" "Людвіг ван Бетховен і яго час" ансамбля "Камерныя салісты Мінска" пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Зубава.

Сакавік у музеі быў насычаны рознымі святамі, сярод іншых можна назваць літаратурна-музычны вечар да Сусветнага дня паэзіі "Слова – радасць, слова – чары", літаратурна-музычны вечар да Міжнароднага дня тэатра.

На кожную з сустрэч прыходзяць у музей вядомыя дзеячы культуры Беларусі. Так, на свяце да Міжнароднага дня тэатра з наведвальнікамі музея сустракаліся заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, народныя артысты Беларусі Генадзь Гарбук і Марыя Захарэвіч, заслужаны артыст Беларусі Валянцін Салаўёў.

На працягу года ў музеі адбылося некалькі прэзентацый значных твораў беларускай літаратуры, сярод іх прадстаўленне манаграфіі "Музыка на Беларусі: ад архаікі да сучаснасці" Рамана Абрамчука.

Каб юбілейны год прайшоў запамінальна і цікава, маладымі супрацоўнікамі аддзела навуковай прапаганды музея была спланавана акцыя "130 прысвячэнняў Песняру". Па ўмовах конкурсу ўдзельнікам можа стаць кожны жадаючы, хто напіша і адправіць на адрас музея вершаваны, празаічны ці драматычны твор, прысвечаны асобе ці творчасці паэта. Аўтарытэтнае журы зробіць адбор найлепшых твораў, якія будуць надрукаваны напярэдадні 3 лістапада (дня нараджэння Якуба Коласа) на старонках "ЛіМа" – інфармацыйнага спонсара акцыі.

У аргкамітэт ужо паступіла некалькі дзясяткаў твораў, у асноўным вершаў, ад людзей самых розных узростаў – ад дашкольнікаў да пенсіянераў. Геаграфія конкурсу даволі шырокая, ахоплены нават замежныя краіны. Плануецца, што ўладальнік Гран-пры будзе мець магчымасць выступіць з чытаннем твора на ўрачыстай цырымоніі ўскладання кветак каля помніка народнаму песняру 3 лістапада 2012 г. на плошчы Якуба Коласа.

Другая значная акцыя юбілейнага года мае на мэце шырокую папулярызацыю творчасці паэта. Яна прадугледжвае чытанне ўслых вершаў Коласа і называецца "Чытаем Коласа разам". Удзельнікамі становяцца практычна ўсе госці дома паэта, як выступоўцы імпрэз, так і слухачы. Не раз гучалі трапяткія радкі з паэм "Сымон-музыка" і "Новая зямля", шматлікія вершы. На працягу года ўдзел у чытанні бралі артысты і чыноўнікі, музыканты, пісьменнікі, навукоўцы. Прачула гучалі Коласавы радкі з вуснаў народнай артысткі Таццяны Мархель, намесніка главы адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска Аляксея Каштальяна, членаў Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, навуковых супрацоўнікаў Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.

Шосты раз музей браў удзел у міжнароднай акцыі "Ноч музеяў". У гэтым годзе на сцэнічнай пляцоўцы музея была магчымасць выступіць членам дабрачыннага савета музея, створанага ў 2010 г. з мэтай збору сродкаў на ўстаноўку скульптурнай кампазіцыі "Якуб Колас. Роздум" на сядзібе музея.

18 мая прайшоў дабрачынны канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча.

Цікавасць у маладых і сталых "начных" наведвальнікаў музея выклікала прэзентацыя музейнага кінаклуба з дэманстрацыяй мастацкіх фільмаў "Палескія рабінзоны" (1934) і "Неадкрытыя астравы" (1974).

31 мая прайшла святочная праграма для ўдзельнікаў VII Беларускага міжнароднага медыяфоруму "Партнёрства ў імя будучыні: мадэлі новай эпохі", удзельнікі якога наведалі мемарыяльныя сядзібы ў Стаўбцоўскім раёне, азнаёміліся з экспазіцыяй музея ў Мінску.

Традыцыйна 1 чэрвеня да Міжнароднага дня абароны дзяцей у музеі адбываецца дабрачыннае мерапрыемства для выхаванцаў дзіцячых дамоў г. Мінска. Маленькія наведвальнікі з задавальненнем глядзяць тэатралізаваную экскурсію па дзіцячых творах Коласа, пасля на памяць аб наведванні музея атрымліваюць

невялікія падарункі ад нашай прафсаюзнай арганізацыі.

Гэты год – юбілейны і для шэрагу рэспубліканскіх выданняў, сярод якіх газета "Звязда". 90 гадоў з дня выхаду першага нумара мы адзначылі сумесным святам са звяздоўцамі "Родная газета на роднай мове" ў межах музейнага праекта "Сяброўскія сустрэчы з рэдакцыямі перыядычных выданняў творчай і навуковай інтэлігенцыі рэспублікі". Да гэтай падзеі была створана адметная выстаўка з уласных фондаў, паколькі мы маем багата матэрыялаў, якія сведчаць пра цесныя стасункі песняра з гэтым аўтарытэтным выданнем.

Чэрвеньскім днём прайшоў семінар прадстаўнікоў прадпрыемстваў турыстычнай індустрыі Беларусі "Магчымасці музеяў як складаючая частка падзейнага турызму і адзін са спосабаў прыцягнення турыстаў у рэгіёны", дзе супрацоўнікі турыстычных фірмаў маглі напрамую пазнаёміцца з турпрадуктам, які можа прапанаваць музей і філіял "Мікалаеўшчына": тэатралізаванымі экскурсіямі, веласіпеднымі прагулкамі па коласаўскім мемарыяльным заказніку, экаэкскурсіяй са зборам лекавых раслін з кансультацыяй спецыяліста-траўніка і г. д.

9 – 10 жніўня 2012 г. адбыўся міжнародны круглы стол "Актуальныя праблемы мемарыяльных музеяў. Традыцыі і наватарства ў іх развіцці і дзейнасці" з удзелам дырэктараў літаратурных мемарыяльных музеяў з Расіі, Літвы, Украіны і Беларусі. Былі вызначаны наступныя мэты: абмен вопытам па ўкараненні новых формаў музейнай камунікацыі і выкарыстанні сучасных тэхналогій у практыцы зносін з мэтавай аўдыторыяй сучасных літаратурных музеяў на постсавецкай прасторы, актуалізацыя праблемы захавання культурнай спадчыны мемарыяльнага статусу, а таксама пашырэнне геаграфіі супрацоўніцтва паміж мемарыяльнымі літаратурнымі музеямі для папулярызацыі нацыянальных культурных каштоўнасцей кожнай з краін-удзельніц за межамі сваёй дзяржавы.

Падчас круглага стала былі асветлены праблемныя пытанні па наступных кірунках: спецыфіка навукова-даследчай працы ў мемарыяльным музеі на сучасным этапе; праблемы захавання і рэстаўрацыі мемарыяльных рарытэтаў; сувязі з грамадскасцю: дасягненні і праблемы; мемарыяльныя музеі ў эпоху новых інфармацыйных тэхналогій; праблема фарміравання музейных фондаў: ад колькасці да якасці; новыя функцыі мемарыяльнага музея ў сістэме сучаснай культурнай прасторы сваёй краіны.

Акрамя беларускіх спецыялістаў, удзел у мерапрыемстве ўзялі і кіраўнікі такіх вядомых мемарыяльных музеяў Расійскай Федэрацыі, як Усерасійскі музей А. С. Пушкіна ў Санкт-Пецярбургу (Сяргей Някрасаў, дырэктар, доктар культуралогіі, прафесар), Дзяржаўны Лермантаўскі музей-запаведнік "Тарханы" (Вера Ульянава, галоўны захавальнік фондаў), Калінінградскі абласны гісторыка-мастацкі музей (Сяргей Якімаў, дырэктар), Літаратурны музей г. Курска (Валянціна Грыгаржэвіч, дырэктар), Арлоўскі аб'яднаны дзяржаўны літаратурны музей І. С. Тургенева (Вера Яфрэмава, дырэктар), Дзяржаўны музей А. М. Горкага (Ірына Луцкая, вучоны сакратар). Былі прадстаўлены мемарыяльныя музеі з Украіны (Кіеўскі літаратурна-мемарыяльны музей Максіма Рыльскага) і Літвы (Літаратурны музей Аляксандра Пушкі-



**Адкрыццё памятнага каменя ў гонар 100-годдзя сустрэчы Якуба Коласа і Янкі Купалы.**




Фрагмент выстаўкі "Колас і Купала – беларускія песняры".

на, г. Вільнюс), якія з'яўляюцца шматгадовымі творчымі партнёрамі Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.

Удзельнікі круглага стала наведалі філіял "Мікалаеўшчына" ў Стаўбцоўскім раёне. На мемарыяльнай сядзібе Смольня абылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага знака ў гонар 100-годдзя першай сустрэчы народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама адкрыццё выставы "Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа" з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа і Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Шырока ў юбілейны год разгорнута выставачная работа. Можна назваць выстаўкі з нашых фондаў:

- "Якуб Колас і НАН Беларусі: да вытокаў беларускай навукі аб слове" (дзейнасць Якуба Коласа на пасадзе віцэ-прэзідэнта АН БССР);
- выстаўка аўтарэфератаў дысертацый па творчасці Якуба Коласа да Міжнароднага дня абароны роднай мовы;
- "Слова – радасць, слова – чары" паводле музейных калекцый "Рукапісы" і "Фотаздымкі" да Сусветнага дня паэзіі;
- выстаўка-інсталяцыя "Якуб Колас і М. Ю. Лермантаў" да сумеснага дэманстравання з выстаўкай фатаграфій "Родныя ўсё мясціны" з фондаў Дзяржаўнага Лермантаўскага музея-запаведніка "Тарханы" (Расійская Федэрацыя); пры ўдзеле Літаратурнага музея М. Багдановіча;
- выстаўка тэатральных лялек "Усмешка клоўна" з прыватнай калекцыі А. В. Грэкава да Міжнароднага дня тэатра;
- "Адгукнуцца, загамоняць струны ўсе яго душы", выстаўка з цыкла "Адкрытыя фонды", якая прадугледжвала экспанаванне музейных прадметаў з калекцыі "Графіка", у прыватнасці работы знакамітых мастакоў Э. Агуновіча і А. Дзямарына;
- "Добры вечар, мае дарагія", выстаўка да Міжнароднага дня музеяў з музейных калекцый "Рукапісы", "Асабісты архіў Якуба Коласа";
- выстаўка ў рамках музейнай акцыі "Выстава на адну гадзіну" (матэрыялы з калекцыі "Рукапісы" – перапіска Я. Коласа і яго знаёмай Алесі Кетлер);
- выстаўка да Года кнігі і Міжнароднага дня музеяў "Выданні Якуба Коласа на розных мовах свету", дзе былі прадстаўлены творы песняра на 38 мовах;
- "Якуб Колас на вайне", выстаўка, прымеркаваная да Міжнароднага дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

Адгукнуўся музей і на другую важную культурную падзею – 130-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы выстаўкай з уласных фондаў "Мой дружа Янка". У экспазіцыі былі прадстаўлены лісты перапіскі Якуба Коласа і жонкі Янкі Купалы Уладзіславы Францаўны Луцэвіч, прысвячэнні Коласа Купалу, рэдкія фотаздымкі.

Да 56-й гадавіны смерці паэта музей падрыхтаваў выстаўку фатаграфій з так званага нарачанскага цыкла фота Міхася Лынькова "Змоўкла шумлівая Нарач", дзе дэманстраваліся малавядомыя шырокаму колу апошнія прыжыццёвыя здымкі Якуба Коласа, а таксама яго малодшых паплечнікаў па пяры: Максіма Лužаніна, Максіма Танка, Міхася Лынькова.

На 2012 год прыпала яшчэ адна юбілейная дата ў жыццяпісе народнага паэта – 110-годдзе пачатку яго педагагічнай дзейнасці, што было засведчана вялікай выстаўкай "Пачэсны шлях настаўніка".

Да 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка мы падрыхтавалі выстаўку "Я заўжды помню голас твой". Наведвальнікі маглі ўбачыць шматлікія рукапісы з перапіскі паэтаў, кнігі з цёплымі дарчымі надпісамі, рэдкія фота сяброў.

Многія выстаўкі да юбілею песняра былі запатрабаваны дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Рэспублікі Беларусь за межамі краіны. Для шырокага азнаямлення з біяграфіяй і творчасцю паэта быў створаны шэраг мультымедыйных варыянтаў выставак па творчасці Якуба Коласа і гісторыі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея паэта на беларускай і англійскай мовах. Такія выстаўкі ўбачылі ва ўніверсітэце г. Гента ў Каралеўстве Бельгія і Нацыянальным універсітэце Рэспублікі Інданезія.

Праведзена таксама некалькі буйных выстаў з уласных фондаў па-за межамі музея:

• "Мой край родной", фотавыстаўка па мясцінах Якуба Коласа ў гарадах Алаверды, Ванадзор, Лоры ў Рэспубліцы Арменія;

• "Па родных мясцінах Якуба Коласа" (графічныя работы па коласаўскіх мясцінах Стаўбцоўшчыны мастака Лазара Рана) у Цэнтры культуры Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча (Варшава);

• выстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, арганізаваная сумесна з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы "Якуб Колас і Янка Купала – беларускія песняры" ў Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеі-запаведніку А. С. Пушкіна "Міхайлаўскае". Былі прадстаўлены графічныя работы А. Александровіча, малюнкі В. Шаранговіча паводле паэмы "Новая зямля", пераклады твораў Якуба Коласа на рускую мову, лісты да Якуба Коласа рускіх пісьменнікаў;

• фотавыстаўка "На радзіме Якуба Коласа" ў Кіеўскім літаратурна-мемарыяльным музеі Максіма Рыльскага;

• выстаўка графікі і фота "Мой родны кут" у Санкт-Пецярбургскім Доме нацыянальнасцей.

Калектыў музея зацікаўлены, каб як мага больш людзей у самых аддаленых ад Мінска населеных пунктах змаглі пазнаёміцца з багатым фондавым зборам Коласавага дома. На працягу года было ажыццёўлена некалькі рэгіянальных выставачных праектаў у абласных і раённых музеях.

Добрыя водгукі мы атрымалі ад наведвальнікаў выставак "Шляхамі майго юнацтва. Дарогамі Брэстчыны" ў Кобрынскім раённым краязнаўчым музеі, дзе сярод іншага былі прадстаўлены ўпершыню работы мастакоў Н. Воранава, Л. Гоманава, В. Жолтак, графічныя работы А. Дзямарына, выданні "Палескіх апавесцей" і рамана-трылогіі "На ростанях" розных гадоў, іх пераклады на іншыя мовы свету, асабістыя рэчы Якуба Коласа, дакументы і рукапісы.

У Музеі гісторыі г. Гомеля адбылася выстаўка "Шляхамі Якуба Коласа. Дарогамі Гомельшчыны".

Выстаўка "Шляхамі песняроў" была падрыхтавана да Беларускага нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі "Маладзечна – 2012" (Маладзечна, Мінскі абласны краязнаўчы музей).

Па-за межамі музея на працягу года па лініі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь дэманстраваліся перасоўная выстаўка "Якуб Колас. Асоба і час" у гарадах Рэспублікі Латвія, фотавыстаўка па жыццяпісе Якуба Коласа ў Плоўдзіўскім дзяржаўным універсітэце (Балгарыя) і ўніверсітэце г. Гданьска (Польшча).

На сваіх плошчах музей прыняў выстаўкі з фондаў іншых культурна-асветных устаноў: Літаратурнага музея А. С. Пушкіна ў Вільнюсе "А. С. Пушкін і Вільня", якая дэманстравалася ў час сумеснай выстаўкі "О, Вільня! Крывіцкая Мекка!" у межах пагаднення аб доўгатэрміновым творчым супрацоўніцтве паміж музеямі. Тут былі паказаны рукапісныя дакументы: лісты Якуба Коласа, кнігі з яго ўласнай бібліятэкі, пераклады паэмы "Палтава" на беларускую мову, мастацкія работы М. Купавы з відамі мясцін Вільні, звязаных з нацыянальным адраджэннем 20-х гг. XX ст. і дзейнасцю Якуба Коласа. З Літаратурнага музея Аляксандра Пушкіна – фотаздымкі родных і блізкіх славутага рускага паэта, выявы музея. Упершыню былі прадстаўлены ўнікальныя прадметы з дома Марыі Каменскай (цешчы Якуба Коласа, якая жыла ў Вільні).

Падчас адкрыцця выстаўкі адбылася перадача копіі фотапартрэта цесця Якуба Коласа Дзмітрыя Каменскага, арыгінал якога захоўваецца ў Літаратурным музеі А. С. Пушкіна ў г. Вільнюсе.

Парадавала гасцей музея выстаўка з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея "Мастакі на вайне" да Міжнароднага дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

Варта дадаць, што акрамя часовых выставачных праектаў музей працягвае доўгатэрміновае экспанаванне надзвычай цікавай маштабнай выстаўкі "Якуб Колас у Каралішчавічах" у былым доме творчасці пісьменнікаў "Каралішчавічы" (цяпер дом адпачынку "На ростанях" ААТ "Белрэмстрой").

**Ганна ЗАЙЦАВА,**
намеснік дырэктара па навуцы
Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага
музея Якуба Коласа.